образом данная находка А.П. Толочко отрицает другую гипотезу этого же исследователя: если художники видели фрески в великорусском Владимире, то предположение о создании рукописи в волынском Владимире представляется избыточным. Итак, выдвинутая версия об «украинском» происхождении РЛ снова распадается на составные части и отдельные наблюдения о характере и возможных источниках миниатюр.

В этом контексте соблазнительной представляется идея снова вернуться к поиску конкретных прототипов миниатюр Радзивиловской летописи за пределами восточнославянского культурного пространства. С самого начала изучения в них видели влияние западноевропейского Средневековья. Но образы, нашедшие отражение в РЛ, собственно, не совсем средневековые. В этих образах видна конкретная эпоха – XV век, период «осени Средневековья» по выражению голландского историка культуры Йохана Хёйзинги. По нашему мнению, можно говорить о «визуальной революции» XV века, когда создатели иллюминированных манускриптов открыли для себя новые темы и по-новому «увидели» окружающий мир. Следы этой «революции» видны в таких памятниках, как: «Книга императора Сигизмунда» Эберхарда Виндеке, «Хроника Констанцского собора» Ульриха Рихенталя, неопубликованная рукопись Иоганна Реллаха в Нюрнберге и др. Все эти памятники датируются второй половиной XV века и имеют некоторые общие признаки: предметное восприятие окружающего мира, интерес к индивидуальному, интерес к чужим обычаям и культурам (и попытки визуализировать их) и др. По нашему мнению, в этом типологическом ряду перспективно рассматривать и визуальные образы Радзивиловской летописи. Данная проблематика требует дальнейшего изучения.

Итак, в изучении Радзивиловской летописи больше вопросов, чем ответов. Знаменитый памятник предстает перед нами таким же загадочным и одиноким, как и сто лет назад. «Научная интрига» сохраняется, что должно, по нашему мнению, побуждать исследователей к поиску новых подходов и выдвижению новых гипотез.


1. Арциховский, А. В. Древнерусские миниатюры как исторический источник / А. В. Арциховский. – М., 1944.
2. Подобедова О. И. Миниатюры русских исторических рукописей. К истории лицевого летописания / О. И. Подобедова. – М., 1965.
3. Радзивиловская летопись / отв. ред. М. В. Кукушкина. – Т. I: Факсимильное воспроизведение рукописи. – СПб.: Глагол; М.: Искусство, 1994.
4. Радзивиловская летопись / отв. ред. М. В. Кукушкина. – Т. II: Текст. Исследование. Описание миниатюр. – СПб.: Глагол; М.: Искусство, 1994.
5. Рыбаков, Б. А. Петр Бориславич: Поиск автора «Слова о полку Игореве» / Б. А. Рыбаков. – М.: Мол. гвардия, 1991.
6. Толочко, А. П. Пририсовки зверей к миниатюрам Радзивиловской летописи и проблема происхождения рукописи / А. П. Толочко // Ruthenica. – 2005. – Vol. IV. – С. 62–84.
7. Толочко, А. П. «Не преступати предела братня» (об источниках миниатюр Радзивиловской летописи) / А. П. Толочко // Ruthenica. – 2014. – Vol. XII. – С. 67–81.



**Скварчэўскі Д.В.**


## АДЛЮСТРАВАННЕ БАЛЦКАГА ПАГАНСТВА Ў ПОМНІКАХ ЛЕТАПІСАННЯ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

Асаблівасцю даследаванняў дахрысціянскай рэлігіі насельніцтва Беларусі і суседніх краін з'яўляецца малая колькасць наратыўных гістарычных крыніц па гэтай тэме. З аднаго боку, звесткі пра паганства ў летапісных помніках даўно вядомыя, а з другога, дагэтуль застаецца прастора для вывучэння, асабліва ў рэчышчы ўяўленняў насельніцтва XV–XVI стст. пра ўласнае мінулае і асэнсавання сваёй культурнай традыцыі. Важнымі з'яўляюцца не толькі звесткі пра тое, якіх багоў ўшаноўвалі, як выглядалі стоды і якія здзяйсняліся абрады, але і кантэкст паведамленняў пра паганства ў летапісных творах, іх сэнс і сувязь з агульным тэкстам.

Неабходна падкрэсліць, што паганства ў гісторыі Беларусі не было адзінай маналітнай рэлігіяй, як гэта часам стэрэатыпна ўяўляецца. Варта казаць пра паганскія рэлігіі, якія хоць і маюць агульны індаеўрапейскі выток, аднак развіваліся ў розныя гістарычныя перыяды ў розных этнакультурных супольнасцях. І гэта таксама прасочваецца ў помніках беларуска-




Репозиторий ВГУ

літоўскага летапісання, дзе зафіксаваны звесткі пра славянскае і, у большай ступені, пра балцкае паганства.

У летапісах другога агульнадзяржаўнага звода (Красінскага, Альшэўскі, Румянцаўскі, Рачынскага, Еўраінаўскі, Археалагічнага таварыства), які быў створаны ў 20-30-я гады XVI ст., знайшла сваё адлюстраванне дахрысціянская балцкая, а менавіта літоўская, традыцыя, што было абумоўлена ідэалагічнымі і палітычнымі задачамі ў дадзены перыяд гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Падобныя звесткі ёсць і ў “Хроніцы Быхаўца”, якая належыць да трэцяга летапіснага звода (50–70-я гады XVI ст.), “Хроніцы Літоўскай і Жамойцкай”, якая грунтуецца на хроніцы Мацея Стрыйкоўскага. Асноўныя сюжэты, звязаныя з балцкім паганствам:

- пахаванне Сперы, апісанне пахавальнага абрада, згадка шанавага стода [3, с. 16–17, 129; 4, с. 130, 146, 174, 194, 215];
- пахаванне Кернаса [3, с. 16–17];
- пахаванне Мікгайлы [3, с. 18];
- пахаванне Паяты, згадка шанавага стода і святых ліп [3, с. 22; 4, с. 91, 131, 148, 176, 196, 217];
- пахаванне Кукавойта, згадка шанавага стода [3, с. 24; 4, с. 92, 131, 148, 176, 196, 217], пахаванне бацькі Кукавойта, узгадваецца шанаваны стод, святыя ліпы і святы гай [3, с. 22];
- апісанне багоў, якім маліўся Міндоўг [3, с. 132–133], вяртанне Міндоўга да паганства [3, с. 27];
- пахаванне Свентарога, апісанне пахавальнага абрада і рэлігійных уяўленняў пра замагільны свет, усталяванне княскай пахавальнай традыцыі [3, с. 30–31, 134; 4, с. 92, 131–132, 149, 177, 197, 218];
- стварэнне Германтам вогненных ахвярнікаў у гонар Перкуна, згадка пра жрацоў і пакаранне праз спаленне на вогнішчы, калі з-за недагляду згасаў святы агонь [3, с. 31];
- пахаванне Германта і Алігіміна [3, с. 31];
- пахаванне Трабуса і Нарымонта [3, с. 32];
- цырымонія сустрэчы Гедыміна пасля вайсковай выправы [3, с. 39];
- заснаванне Вільні, тлумачэнне сна Ліздзейкам [3, с. 39, 138; 4, с. 96, 153, 201, 222];
- усталяванне Гедымінам свяцілішча і стода Перуна [3, с. 41];
- пахаванне Гедыміна [3, с. 41–42];
- цырымонія сустрэчы Альгерда [3, с. 62];
- забойства манахаў у Вільні [3, с. 140–141];
- шлюб Кейстута з Бірутай [3, с. 62, 138; 4, с. 154, 201, 222];
- цырымонія сустрэчы Ягайлы, выпадак з часткай дрэва святога крыжа [3, с. 144].

Як можна заўважыць, балцкая паганская традыцыя з’яўляецца элементам сюжэтаў як легендарнай часткі, так і гістарычнай да часоў хросту Літвы Ягайлам. Пералічаныя сюжэты лагічна ўпісаны ў агульны аповед, які раскрывае гісторыю дзяржавы. Паганства выступае як неад’емная частка ўласнай гістарычнай літоўскай традыцыі, што адлюстравана і ў пахавальным княскім звычаі, і ў паданні пра заснаванне Вільні, і ў звычаі сустрэчы князя насельніцтвам.

Нягледзячы на шаблоннасць тэкстаў, паведамленні пра паганства ўтрымліваюць рэальную этнаграфічную інфармацыю. У XVI ст. у ВКЛ яшчэ працягвалі існаваць у сялянскім асяродку паганскія абрады, звычаі, уяўленні. Іх апісвалі у сваіх творах Мацей Стрыйкоўскі, Міхалон Літвін, Ян Малецкі, Ян Ласіцкі, Олаф Магнус, Паўль Одэрборн. Сляды існавання паганскіх культаў у гэты перыяд таксама прасочваюцца археалагічна.

Выкарыстанне балцкай паганскай мінуўшчыны тлумачыцца яшчэ тым, што з XVI ст. у летапісах, хроніках і публіцыстычных творах ВКЛ актыўна пачынае распаўсюджвацца “рымская легенда”, якая стала той формай, у якой адбылося асэнсаванне паганства ў ВКЛ. У княстве назіралася цікавасць да паганскай спадчыны, бо яна наўпрост сведчыла аб старажытнасці літоўскага народа і яго рымскіх каранях. Непасрэднае перасялення рымлян на тэрыторыю будучай Літвы азначала для аўтараў XVI ст. аўтаматычны перанос рымскага паганства ў Літву. Так, напрыклад, пры пахаванні легендарнага князя Сперы, сына Палемона, згадваецца, што яго пахавалі і ўсталявалі ў памяць ідала “подле римского обычая” [4, с. 129]. Таксама ў тагачаснай літаратуры сустракаюцца пэўныя спробы перанясення міфа пра Ромула і Рэма на тутэйшую

глебу. Аўтар "Хронікі Літоўскай і Жамойцкай", апісваючы паходжанне Ліздзейкі, параўноўвае з паходжаннем Ромула і Рэма [3, с. 39–40]. У такім кантэксце заснаванне Вільні зводнымі братамі Ліздзейкам і Гедымінам ўскосна параўноўвалася з заснаваннем Рыма братамі Ромулам і Рэмам. Цікава, што ўжываліся метады параўнальнай міфалогіі для абгрунтавання праўдзівасці гісторыі. Асэнсаванне літоўскага паганства ў кантэксце "рымскай легенды" павінна было стаць дадатковым аргументам на карысць праўдзівасці легенды пра рымскае паходжанне літоўскай шляхты.

Варта звярнуць увагу на тэрміналогію паведамленняў пра балцкае паганства, якая перадае мясцовыя жывыя паняткі. Для пазначэння культавай скульптуры выкарыстоўваюцца тэрміны 'балван' і 'исътолп', а не царкоўнаславянскія 'кумир' ці 'идол'. Паходжанне тэрміна 'балван' да канца не высветлена [5, с. 291], аднак літоўскі даследчык Дайнюс Разаўскас выказаў меркаванне, што тэрмін 'балван' можа мець балцкую этымалогію і звязвацца з літ. balva 'дарунак, хабар', balvoti 'падкупіць, даць хабар'. У літоўскай мове (і не толькі) паняткі 'дарунак' і 'ахвяра' шчыльна звязаны, і, такім чынам, балван – гэта 'той, каму прыносяць ахвяры' [6, p. 131]. З паняццем 'исътолп', відавочна, звязаны тэрмін 'стоўб', якім пазначалася сакральнае месца ля печы ў беларускай хаце, дзе спраўлялі розныя абрады. Адметна, што гэты стоўб таксама, як і культавую скульптуру, называлі 'балванам' [5, с. 291]. Вельмі верагодна, што словам 'исътолп' пазначаліся менавіта драўляныя ідалы, што мелі форму слупа. Пра гэта сведчыць і фрагмент трактата 1622 г. манаха Жыровіцкага манастыра Феадосія: "Семдесят прекладачов преложыли рытыну идолом, то ест балванъ […] а балванъ есть фалшывое подобенство то ест значачы то, чого правдиве немашъ, яко гды погане выставляли слупы Венере, або Менерве, оные знаки балваном были" [2, с. 56]. Пра тое, што культавая скульптура была драўлянай, сведчаць летапісныя радкі: "А потом тот болван изгнил" [4, с. 217]. Аднак, як вядома, культавая дахрысціянская скульптура была і каменнай, што таксама знайшло сваё адлюстраванне ў помніках беларуска-літоўскага летапісання: "Поставил еще Кгедимин болвана перунова з каменя кременистого великого" [3, с. 41].

Для хрысціянскіх аўтараў ушанаванне ідалаў з'яўлялася галоўнай характарыстыкай дахрысціянскіх культаў; адсюль паходзіць і тэрмін 'балвохвалства' – ідаласлужэнне, якім пазначалася паганская вера. Рэлігійная традыцыя яшчэ хавалася пад выразамі: "поганской вѣри", "звычаю своего поганского", "обычаем поганским", "войско з литвы, прусов поганов", "безвѣрные литвы", "безбожное литвы", "поганы", "поганцы".

У летапісах ВКЛ тэрмін 'жеглище' пазначае як месца, дзе адбывалася пахаванне паводле абраду крэмацыі [4, с. 197], так і месца ахвярапрынашэнняў, дзе гарэў "вечны" агонь [3, с. 31]. Акрамя ідалаў і святых агнёў летапісы згадваюць наяўнасць шанаваных дрэў (ліпы) і святых гаёў, якія называлі імёнамі легендарных уладароў.

Балцкае паганскае жрэцтва пазначана тэрмінамі 'ворожбит', 'попы поганские'. Летапісныя звесткі дазваляюць меркаваць пра наяўнасць жрэцкай іерархіі, бо пра Ліздзейку гаворыцца, што "за Гедимина найвышшим зостал поганским бискупом" [3, с. 39], ці быў "у князя Кгиндимина ворожбитом навышшим, потом попом поганским" [4, с. 96]. Паводле летапісаў ВКЛ, паганскія святары выконвалі функцыі дарадцаў, тлумачэння сноў і нябесных з'яў, варажбы, ахвярапрынашэнняў, захоўвання і падтрымання "вечнага" агню. Летапісы, распавядаючы пра Біруту, сведчаць, што святарскія функцыі маглі выконваць і жанчыны: "которая ж дѣвка богом своим подлуг обычаю поганского пошлюбила чыстость ховати, и сама была хвалена от людеи за богиню" [4, с. 154].

У "Хроніцы Быхаўца" маецца пералік багоў, якім маліўся Міндоўг: "perszym Nonadajawi, Telaweli, Dyweryk, zaieczyiemu bohu y Medynu" [3, с. 132–133]. Гэта фрагмент узяты з Галіцка-Валынскага летапіса [1, с. 123]. У творы, які ў якасці дадатка выдадзены ў 32 томе "Полного собрания русских летописей" мы знаходзім: "татаре великими голосами кричали: "Янда, янда, диварикса", яко бы богу полецалися, а не дияволу" [3, с. 208]. Насамрэч гэта не татарскі, а літоўскі заклік багоў, які таксама знаходзім у Галіцка-Валынскім летапісе: "по-свойскы рекуща: "Янда", възывающе Богы своа, Аньдая и Дивирикса, и вся Богы своа поминающи, рекомыа бѣси" [1, с. 133]. Нельга не заўважыць, што аўтар "Хронікі Літоўскай і Жамойцкай" падкрэслівае этнічны характар паганскай рэлігіі ў ВКЛ праз ужыванне балцкага тэоніма Пяркун [3, с. 31].

Варта звярнуць увагу на ўрывак з апісаннем міфалагічных уяўленняў пра замагільны свет: "и так знаменали собе, иж бы бог мел прийти и седети на горѣ высокои и судити живым и мертвым, на которую будет гору трудно взыити без тых ногтеи рысих або медвежих, и для того

Рэпазіторый ВДУ

тыи ногти подле тых кладывали, на которых мели на тую гору лезти и на суд до бога ити. А так, ачколвек поганыи были, а вжиж потом собе знаменали и в бога одного вѣриля, иж судныи день мел быти, и вѣрили з мертвых востаню и одного бога, которыи мает судити живым и мертвым" [4, с. 92]. Гэты фрагмент адметны тым, што адлюстроўвае працэс дапасавання паганскіх ідэй да хрысціянскага веравучэння. Аўтар падкрэслівае, што старажытныя балты хоць і былі паганцамі, але ўсё адно трымаліся веры ў аднаго бога, божы суд і ўваскрашэнне. А праз гэта хрост Літвы летапісцам падаецца і ўспрымаецца цалкам заканамерным крокам. Бог у дадзеным выпадку яшчэ не хрысціянскі, але паганскі Dievas, імя якога ўвайшло ў літоўскі хрысціянскі іменаслоў, як гэта адбылося з лацінскім Deus ды славянскім Бог.

У завяршэнні вылучым асноўныя высновы, якія можна зрабіць на падставе адзначаных назіранняў:

1) Інфармацыя пра літоўскае паганства ў помніках летапісання ВКЛ адпавядае гістарычнай рэчаіснасці, што пацвярджваецца археалагічнымі, этнаграфічнымі, фальклорнымі і лінгвістычнымі звесткамі. Аўтары не толькі пераказвалі вядомыя паданні, але з'яўляліся сучаснікамі жывых захаваных традыцый.

2) Паведамленні лагічна ўпісаны ў агульны аповед, які раскрывае гісторыю дзяржавы. Паганства не ўспрымаецца чужой з'явай, не выстаўляецца ў негатыўным святле, але выступае неад'емнай часткай уласнай культурнай і гістарычнай літоўскай традыцыі, да якой ставяцца з павагай.

3) Звесткі пра літоўскае паганства аўтары выкарыстоўвалі ў кантэксце "рымскай легенды", былі дадатковымі аргументамі на карысць яе праўдзівасці і адным з доказаў рымскага паходжання літоўскай шляхты.


1. Галицко-Волынская летопись: текст, комментарий, исследование / составители: Н. Ф. Котляр, В. Ю. Франчук, А. Г. Плахонин. – СПб. : Алетейя, 2005. – 421 с.
2. Мальдзіс, А.І. Невядомы помнік палемічнай літаратуры XVII ст. ("О образех, о реликвях") / А.І. Мальдзіс, І.І. Крамко // Беларуская лінгвістыка. – Вып. 24. – 1983. – С. 57–61;
3. Полное собрание русских летописей. Т. 32. Хроники: Литовская и Жмойтская, и Быховца. Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного / сост., авт. предисл. и ред. т. Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1975. – 233 с.
4. Полное собрание русских летописей. Т. 35. Летописи Белорусско-литовские / сост., авт. предисл. и ред. т. Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1980. – 305 с.
5. Этымалагічны слоўнік беларускай мовы / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мовазнаўства імя Я. Коласа. Т. 1: А–Б / [В. У. Мартынаў і інш. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 440 с.
6. Razauskas, D. Balvonas: skolinys ar veldinys? / D. Razauskas // Baltai ir slavai: dvasinių kultūrų sankirtos. Балты и славяне: пересечения духовных культур. – Vilnius, 2014. – P. 115–131.



**Кудрявцева Р.-Е.А.**


## РУСЬ И ЛИТВА: ФОРМИРОВАНИЕ ОБРАЗА В РУССКИХ И БЕЛОРУССКО-ЛИТОВСКИХ ЛЕТОПИСЯХ

Образ Руси и Литвы в русских и литовских летописных источниках формировался как форма отражения исторической реальности. Собственно понятие «образ» – философская категория, отражающая результат и форму отражения объекта в человеческом сознании, чьим материальным образом являются различные языковые модели.

Образ Руси и Литвы в летописях строился на основании реальных событий прошлого, известных летописцу лично или по рассказам очевидцев или полученных путем многоэтапной передачи фактов от очевидца к летописцу, обработанных в сознании летописца. Тогда в летописи сообщение о событии будет представлено в виде образа, сочетающего в себе черты реальности объективной и ее отражение в восприятии и оценке автора летописи.

Изучая летописи, нужно учитывать то, что они отличаются от других источников, так как носят субъективный характер, создаются летописцем, вкладывающим в их создание не только свой труд, но и свое видение событий, отношение к ним и их интерпретацию.

На содержание и характера образа влияли условия и способы формирования. К этим условиям могли относиться и место написания летописи, и родина летописца, и удалённость летописца от места событий, род его занятий, сословная принадлежность, приближенность к политическим деятелям и дворам, степень литературного таланта. Все эти условия могут влиять на восприятие авторами летописей исторической действительности. Также важным фактором яв-



Репозиторий ВГУ